мыя Беларусы. І цяпер, у вольнай Амэрыцы прадаўжаеш Ваша рабіць тое самае. Зь Беларусамі Ваша Беларус, але каб, крый Божа, не даведаліся пра гэта Палякі; а тым часам тыя–ж Палякі болей шануюць тых, што не хаваюцца із сваёй беларушчынаю. І ніякае карысьці Ваша ад свайго прыкідаваньня Паляком ня будзеш мацць. Нічога не здабылі тыя, што просьле вайны хавалі сваю нацыянальнасьць і самых сябе сярод чужых, як нічагусенькі ня стацілі, а наадварот, часта здабылі тыя, што адкрыта прызналіся да свайго народу, працавалі й дзеялі як Беларусы. Ваша ў сваім лісьце не забыўся пахваліць маскоўскіх бальшавікоў за іхную рэформу, але забыўся адцеміць, што тыя–ж маскоўскія бальшавікі накінулі сваю русыфікацыйную „рэформу“ нашай мове. Наадварот, Ваша яшчэ дагэтуль пішаш іхным „правапісам“, дарма што ўжо 11 год як Ваша ад іх звольніўся. (Праўда, і ў гэтай, накіненай Масквою, „рэформе“ Ваша неахайны: „цьвёрды“, але „ствярджаць“, „насьвеце“, „дзюбатый“ а інш.) Ваша несправядліва ўпікаеш нам архаізмамі. Наагул у нашай мове архаізмаў нямашака (адзін адноўлены архаізм „спадар“ ужываеш і Ваша). Але так „архаічна“, як Ваша ставіш знакі прыпынку, ставілі іх Беларусы толькі ў XI—XIII стг. А Ваша–ж быў кіраўніком асьмігодкі! Дык у комплексе нацыянальнай мяншыні прычына Вашэцевага нараканьня. Ваша шануеш толькі чужое, але ад свайго ўцякаеш, у ім Ваша неахайлівы, пішаш так, як сьліна ў рот прыносіць.

# Характар а гаспадарстваы лад старавечных Беларусаў, Украінцаў а Расійцаў

Украінец, проф. М. Чубаты піша:

Кіеўскае гаспадарства дзяржалася моцнай цэнтральнай уладаю кіеўскага цэнтру. Гэтая цэнтральная ўлада аслабла па сьмерці Яраслава Мудрага (1054), і тады падзялілася старое Кіеўскае гаспадарства. Адразу вынырнулі этнічныя індывідуальнасьці іншых пляменных групаў — народ беларускі і народ расійскі. Цяпер паўсталі асобныя гаспадарствы на аснове іхных нацыянальных якасьцеў і акалічнасьцеў, што ўплывалі на іхную гісторыю.
На Ўкраіне арыстакратычны баярскі элемэнт адзержыў верх і ходаўся зь мескай дэмокрацыяй, прадстаўлянай мескім вечам (агульнай зборкаю). Князі часта апіраліся на мескую дэмократыю, але ўканцы баяры канчальна адзержылі верх. Гэта найляпей відаць у Галіцка–Валынскім Каралеўсьцьве. Дэмократычны лад стаўся характарыстычнай рысаю ўкраінскага народу толькі ў наступным пэрыядзе, калі, па страце вышшых клясаў, украінскія масы ў казацкім гаспадарсьцьве аднавілі нацыю.
У беларускім Полацку мескае веча панавала і прадстаўляла мескае жыхарства пад кіраўніцтвам багатых мескіх клясаў. Ганзейскія месты, што гандлявалі зь беларускімі местамі пераз Балтыцкае мора, малі ўплыў на хундамэнты беларускага рэспубліканства.
Дэспотычная ўлада князёў сталася характарыстычнай рысаю трэйцяга ўсходнеэўропскага народу — расійскага, паўсталага на колёніяльных прасторах Кіеўскае Русі з цэнтрамі ў Суздалю, Валадзімеру ля Клязьмы і наапошку ў Маскве.
Цікава, што гэтыя самыя пагляды на падзел і на характар новых палітычных цэнтраў у ўсходняй Эўропе выказаў аўторытэт у гісторыі расійскага права М. Уладзімірскі–Буданоў.

Да сказанага проф. М. Чубатым трэба дадаць, што ў Беларусаў ня толькі было Вялікае Княства Полацкае, але яшчэ Вялікія Княствы — Северскае, Смаленскае, Турава–Пінскае, рэспубліка Вялікі Пскоў і — пасьлей — Вялікае Княства Разанскае.